# РАЗВИТИЕ ОБРАЗОВАНИЯ, НАУКИ И КУЛЬТУРЫ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ



**А.Ф. САМУСІК**

## *З ГІСТОРЫІ СТАНАЎЛЕННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ (КАМЕРЦЫЙНАЙ) АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ*

Эканамічная адукацыя на Беларусі доўгі час развівалася ў рамках агульнаадукацыйнага курса ў сярэдніх ордэнскіх навучальных установах. Працэсс афармлення яе ў асобны накірунак адукацыйнай справы значна паскорыўся пасля стварэння ў 1773 г. у Рэчы Паспалітай Адукацыйнай камісіі — першага свецкага міністэрства асветы ў Еўропе. Распрацаваныя гэтай камісіяй школьныя статуты прадугледжвалі наяўнасць у вучэбнай праграме "карысных для жыцця прадметаў", дзе акрамя іншага выкладаліся: рамяство (гісторыя, асноўныя мясцовыя віды), з наведваннем майстэрань і рынкаў; дзяржаўная эканомія (вывучаліся эканамічнае развіццё еўрапейскіх краін і працэссы цэнаўтварэння) [1, *18—19*].

У канцы XVIII ст. уся тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе Расійскай імперыі, дзе ўжо мелася спецыяльная камерцыйная школа — у 1773 г. у Маскве была створана новая навучальная ўстанова з адпаведным ухілам у вучэбным працэсе. У XIX ст. колькасць камерцыйных вучылішчаў стала пашырацца. Пры гэтым, трэба адзначыць, што з'яўляліся яны даволі рэдка і не мелі ні адзінай праграмы, ні агульнага кіраўніцтва. Такія школы засноўваліся пераважна пры універсітэцкіх цэнтрах у Пецярбургу, Маскве, Адэсе, Харкаве, дзе распрацоўваліся статуты і адкуль запазычваліся падручнікі. Менавіта з выкладчыкаў і выхаванцаў гэтых універсітэтаў фарміраваліся настаўніцкія калектывы камерцыйных устаноў. Зразумела, што Беларусь, якая з 1832 г. была пазбаўлена ўласнага універсітэта, мела і менш шанцаў заснаваць уласную камерцыйную школу. Адзіная спроба адкрыць камерцыйнае вучылішча ў Магілёве адбылася ў 1859—1864 гг., аднак правалілася з прычыны недахопу сродкаў і выкладчыкаў [2, *106*]. Але такі падыход улад да камерцыйнай адукацыі быў часовай і вымушанай справай. У 60—70-х гг. XIX ст. быў завершаны працэс стварэння ў імперыі адзінай сістэмы агульнаадукацыйнай асветы. Менавіта на той перыяд і прыходзяцца першыя мэтаасэнсаваныя крокі Міністэрства народнай асветы па арганізацыі і эканамічнай адукацыі насельніцтва. Так, згодна статуту рэальных вучылішчаў 1872 г. пры іх па жаданню школьнага кіраўніцтва і насельніцтва маглі ствараецца камерцыйныя аддзяленні з двухгадовым курсам навучання. Спачатку ініцыятыва Міністэрства народнай асветы знайшла шырокі водгук у навучальных акругах — большасць рэальных вучылішчаў адкрылі адпаведныя аддзяленні. Але адсутнасць фінансавай падтрымкі з боку казны, недахоп выкладчыкаў, нявызначанасць статуса гэтых камерцыйных аддзяленняў, нераспрацаванасць вучэбных праграм прывялі да хуткага закрыцця

---

*Андрэй Фёдаравіч САМУСІК, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі Беларусі і замежных краін БДЭУ.*

большасці з іх. Да таго ж рэальных вучылішчаў у канцы XIX ст. было яшчэ вельмі мала (на Беларусі ўсяго 3 — у Мінску, Пінску і Магілёве) [3, *34—35*].

Пачатак зараджэння асобнай камерцыйнай адукацыі ў Расійскай імперыі быў пакладзены 9 мая 1894 г., калі спецыяльным указам абвяшчаўся намер улад падрыхтаваць праект стварэння ў імперыі сеткі камерцыйных школ розных тыпаў. Па хадайніцтву прадстаўнікоў прамысловай і гандлёвай буржуазіі яны павінны былі падпарадкоўвацца Міністэрству фінансаў, і толькі камерцыйныя аддзяленні рэальных школ засталіся пры Міністэрстве народнай асветы. 15 красавіка 1896 г. Мікалай II зацвердзіў "Агульнае палажэнне аб камерцыйных навучальных установах", згодна якому яны падзяляліся на камерцыйныя вучылішчы, гандлёвыя школы, гандлёвыя класы пры агульнаадукацыйных школах, курсы камерцыйных ведаў. Адкрывацца яны маглі на грошы дзяржавы, а таксама на прыватныя і грамадскія сродкі. Фундатары (таварыствы і заможныя грамадзяне) атрымалі права ўваходзіць у склад спецыяльных папячыцельскіх саветаў, якія ствараліся пры кожнай школе і кіравалі не толькі фінансавым бокам іх дзейнасці, але вырашалі шэраг пытанняў, звязаных з вучэбна-выхаваўчым працэсам (прызначалі дырэктара, праводзілі ўступныя і выпускныя экзамены). Планавалася арганізоўваць як мужчынскія, так і жаночыя вучылішчы (было дазволена і сумеснае навучанне). Пры гэтым неабходна адзначыць адносна невысокі статус такіх школ у тагачаснай сістэме адукацыі — толькі камерцыйныя вучылішчы лічыліся сярэднімі навучальнымі ўстановамі, а астатнія мелі правы пачатковых школ [4, *43*].

Хутка стала бачна патрэба ў стварэнні вышэйшай ступені эканамічнай сістэмы асветы — камерцыйных вышэйшых навучальных устаноў, куды б маглі паступаць лепшыя выхаванцы камерцыйных вучылішчаў і дзе б распрацоўваліся новыя вучэбныя праграмы і падручнікі, а таксама рыхтаваліся выкладчыкі. Аднак адкрыць іх прыватныя асобы і нават таварыствы былі не ў стане — неабходна была значная фінансавая дапамога з боку дзяржавы. Да 1914 г. у імперыі адкрылася ўсяго 6 "камерцыйных курсаў вышэйшага тыпа", большасць з якіх па сутнасці была сярэднеспецыяльнымі навучальнымі ўстановамі. Статус вышэйшай навучальнай установы атрымалі ўвогуле толькі 2 камерцыйныя інстытуты — ў Маскве і Кіеве (тэрмін навучання 4 гады). Недахоп у эканамічных вышэйшых навучальных установах кампенсаваўся тым, што выпускнікі камерцыйных вучылішчаў маглі паступаць у імперскія вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы (палітэхнічныя і сельскагаспадарчыя інстытуты) [5].

На Беларусі першыя камерцыйныя вучылішчы з'явіліся крыху пазней, чым ва ўласнарасійскіх губернях. Віленская навучальная акруга, куды ўваходзілі беларускія землі, была адзінай у імперыі, дзе з прычыны "пастаяннай небяспекі паўстання" расійскія ўлады пасля 1863 г. забаранілі адкрываць вышэйшыя навучальныя ўстановы любога тыпу. Вынікам гэтага быў трывалы недахоп выкладчыкаў нават у агульнаадукацыйных школах усіх узроўняў (ад прыходскіх вучылішчаў да гімназій). Таму зразумела, што большасць новых камерцыйных школ планіравалі адкрыць у губернскіх і буйных паветовых гарадах — тут было шмат іншых навучальных устаноў, выкладчыкі якіх, па меркаванню ўлад, маглі б працаваць па сумяшчальніцтву і ў камерцыйных вучылішчах. Гэта хаця б на першым этапе іх дзейнасці дазволіла вырашыць праблему забеспячэння добраадукаванымі настаўнікамі і ўзняць аўтарытэт новых школ.

Першая камерцыйная школа на Беларусі была адчынена 6 лістапада 1901 г. у Мінску (статут школы быў зацверджан у Пецярбургу 8 ліпеня таго ж года). Гэта было мужчынскае сямікласнае вучылішча, існаваў яшчэ падрыхтоўчы клас для 9—11-гадовых юнакоў. Заснавальнікі новай навучальнай установы здолелі арганізаваць значную фінансавую падтрымку — 5 тыс. р. штогод з казны Мінскай гарадской думы і дадатковыя іншыя ахвяраванні. Дзякуючы гэтаму быў пабудаваны ўласны каменны школьны будынак (1905), створана добрая вучэбна-матэрыяльная база: вучылішча мела вялікую бібліятэку, фізічны кабінет, музей узорных тавараў, лабараторыі па хіміі і таваразнаўству. Кіраваў вучылішчам папячыцельскі савет, куды ўваходзілі дырэктар, інспектар, прадстаўнік выкладчыцкага камітэта, 5 членаў, абраных гарадскім кіраваннем (выбары кожныя 4 гады), і назіральнік ад Міністэрства фінансаў. Савет збіраўся раз у месяц і займаўся пераважна гаспадарчымі пытаннямі (кантроль за матэрыяльнай часткай вучылішча, размеркаванне сродкаў, складанне фінансавых справаздач, рамонт будынкаў,

прэміі лепшым выкладчыкам), але акрамя гэтага ён таксама абіраў дырэктара і праводзіў прыёмныя і выпускныя экзамены. Пры паступленні ў школу перавага аддавалася жыхарам горада. Тым самым, дарэчы, стымулявалася адкрыццё падобных школ у іншых гарадах і мястэчках губерніі. Нягледзячы на абмежаванні, у 1912 г. тут вучыўся 451 юнак. Навучанне было платным: падрыхтоўчы, 1 і 2 класы — 70 р. штогод, 3—5 класы — 90 р., спецыяльныя — 125 р. штогод. Такім чынам, плата за навучанне была даволі высокай (у рэальных вучылішчах яна вагалася ад 40 да 60 р. штогод), а таму значная частка выхаванцаў тут была з асяроддзя буйной і сярэдняй буржуазіі [6, *6—29*].

Наступнае камерцыйнае вучылішча ў Мінску было адкрыта восенню 1905 г. Гэта было прыватнае жаночае сямікласнае вучылішча, якое ўзначальваў І.І.Самойла (дырэктар мясцовага рэальнага вучылішча). Але спадзяванні на значныя зборы за навучанне не апраўдаліся: калі ў 1905 г. сюды паступіла 152 дзяўчынкі, то ў 1912 г. у вучылішчы засталося ўсяго 14 вучаніц. Прычынай гэтага былі як кансерватыўныя погляды на неабходнасць прафесійнай эканамічнай адукацыю для жанчын, так і звычайны недахоп сродкаў у зацікаўленых гарадскіх колах. Знайсці грошы ў іншым месцы заснавальнік не здолеў. У 1914 г. з прычыны недахопу сродкаў школа спыніла сваё існаванне [7, *288*].

Падобнае становішча назіралася і ў іншых гарадах Беларусі, Там, дзе ўдзел у фінансаванні дзейнасці камерцыйных вучылішчаў бралі на сябе органы гарадскога самакіравання ці нейкія грамадскія арганізацыі, навучальныя ўстановы працавалі больш-менш стабільна. А прыватныя школы, створаныя нават з удзелам мясцовых таварыстваў выкладчыкаў, не заўсёды вытрымлівалі канкурэнцыю з агульнаадукацыйнымі дзяржаўнымі і прыватнымі гімназіямі, прагімназіямі, рэальнымі і гарадскімі вучылішчамі. Не дзіўна таму, што да 1917 г. на Беларусі было заснавана толькі 12 камерцыйных навучальных устаноў, хаця безумоўна пры належнай падтрымцы з боку дзяржавы іх магло быць значна больш. Памылкай урада была падпарадкаванасць гэтых вучылішчаў Міністэрству фінансаў, а не Міністэрству народнай асветы, якое безумоўна мела куды больш вопыту ў пытаннях адукацыі. Частка насельніцтва з недаверам аднеслася да школ, якія не кантраляваліся Віленскай акругай. Выкладчыкам цяжка было працаваць адначасова ў розных ведамствах, а пераходзіць з агульнаадукацыйных школ у камерцыйныя рызыкавалі не многія. Міністэрства народнай асветы пры недахопе выкладчыцкіх кадраў таксама супрацiўлялася гэтаму.

Значная большасць камерцыйных вучылішчаў на Беларусі была адчынена ў 1906—1909 гг., што было звязана з адноснай стабілізацыяй грамадскага жыцця пасля рэвалюцыі 1905 г. Акрамя таго, у 1905 г. было створана новае Міністэрства гандлю і прамысловасці, якому і даручылі займацца пытаннямі эканамічнай адукацыі. Вучэбны аддзел гэтага міністэрства распрацаваў спецыяльную праграму інтэнсіўнага пашырэння колькасці менавіта камерцыйных вучылішчаў. Так, калі ў 1905 г. іх па імперыі было ўсяго 10, то ў 1912 г. — ужо 219. Адчулі рэалізацыю гэтага плана і на Беларусі — у 1906 г. прыватныя сямікласныя мужчынскія камерцыйныя вучылішчы пачалі працу ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Брэсце. Жаночыя прыватныя трохкласныя школы пачалі працу ў Мінску (да 1909 г.) і Віцебску. Здолелі сабраць сродкі на арганізацыю камерцыйных вучылішчаў і шэраг грамадскіх арганізацый. У 1906—1907 гг. у Віцебску Пазыкова-ашчаднае таварыства і Таварыства прыказчыкаў заснавалі мужчынскае, а Таварыства выкладчыкаў — жаночае сямікласныя камерцыйныя вучылішчы. У 1908—1909 гг. былі створаны мужчынскія навучальныя ўстановы ў Магілёве і Слуцку [8, *20;* 9, *34, 187;* 10, *56*].

Нягледзячы на тое, што большасць з іх былі сямікласнымі навучальнымі ўстановамі і мелі ідэнтычныя вучэбныя праграмы, колькасць выкладчыкаў у кожным выпадку залежыла ад матэрыяльнага стану школы. Напрыклад, Віцебскае мужчынскае камерцыйнае вучылішча мела ў 1912 г. 19 выкладчыкаў (у мясцовым рэальным — 13), а Слуцкае — толькі 12 ( адзін выкладчык чытаў некалькі прадметаў). З 19 выкладчыкаў Віцебскага камерцыйнага вучылішча амаль трэць працавалі дзе-небудзь яшчэ: каталіцкі законанастаўнік С. Добрскі — у мясцовай мужчынскай гімназіі, прыватнай гімназіі І. Неруша і ў Аляксееўскай жаночай гімназіі; у гімназіі І. Неруша таксама працавалі праваслаўны законанастаўнік

В. Баршчэўскі і выкладчык Ф. Грудніцкі; выкладчыкі Э. Гінтэр і В. Нужны вялі заняткі ў мясцовым рэальным вучылішчы і г.д. [8, *19—20*].

Астатнія тыпы камерцыйных школ на Беларусі не атрымалі распаўсюджвання. З прычыны адсутнасці ў краі універсітэта найбольш таленавітая і заможная моладзь адпраўлялася ў Расію і Украіну. Да таго ж зноў існавала праблема сродкаў. Менавіта таму, гандлёвых класаў тут увогуле не было, адзіная трохкласная гандлёвая школа дзейнічала ў Мінску (зачынена ў 1918 г.), а бухгалтарскія курсы працавалі толькі ў Магілёве. Але і яны не здолелі цалкам разгарнуць сваю дзейнасць. Мінская гандлёвая школа мела ўсяго 5 выкладчыкаў, якія вялі заняткі па рускай мове, матэматыцы, гісторыі, геаграфіі і спецыяльных прадметах (таваразнаўства, асновы бухгалтэрыі і рахункаводства). Гэта значна менш, чым патрабавалася статутам гандлёвай школы [11, *48*; 12, *53*].

Важнай праблемай, якая паўстала перад расійскімі ўладамі пры стварэнні камерцыйнай сістэмы адукацыі ў заходніх рэгіёнах імперыі, была "небяспека" пераўтварэння гэтых навучальных устаноў у амаль цалкам яўрэйскія. З мэтай спрыяння эканамічнай адукацыі менавіта славянскай часткі гараджан у Палажэнне аб камерцыйных навучальных установах быў унесены параграф аб абмежаванні ў школах колькасці яўрэйскіх выхаванцаў — не больш 40 %. Аднак дасягненне Пецярбургам сваіх мэтаў такім шляхам аказалася нерэальным. Камерцыйныя вучылішчы цалкам залежылі ад збораў за навучанне, а таму патрабаванне расійскіх улад вяло б іх да разарэння. Менавіта гэта акалічнасць і стала асноўнай прычынай ігнаравання кіраўніцтвам большасці беларускіх камерцыйных школ гэтага патрабавання ўлад. Па падліках айчыннай даследчыцы прафесійнай адукацыі Н. Новік у некаторых школах яўрэйскія выхаванцы складалі да 90 % [13, *12*]. Пацвярджае гэта і наяўнасць у шэрагу камерцыйных навучальных устаноў двух яўрэйскіх законанастаўнікаў на аднаго праваслаўнага і аднаго каталіцкага, як, напрыклад, у Слуцкім камерцыйным вучылішчы М. Кірыякава [9, *187*].

У цэлым па імперыі стварэнне камерцыйнай сістэмы асветы было ў асноўным завершана да пачатку першай сусветнай вайны. У краіне ў гэты час дзейнічала 465 камерцыйных навучальных устаноў: 219 камерцыйных вучылішчаў, 128 гандлёвых школ, 89 камерцыйных курсаў, 23 гандлёвых класа, 6 камерцыйных школ вышэйшага тыпу. У іх працавалі 6850 выкладчыкаў (частка па сумяшчальніцтву). Толькі ў 1912 г. тут вучыліся 96 838 выхаванцаў (18 818 дзяўчат): у камерцыйных вучылішчах — 56 266 (11 809); у гандлёвых школах — 19 052 (3725); на камерцыйных курсах — 8101 (2365); у гандлёвых класах — 5539 (719); у вышэйшых школах — 7880 (200). На ўтрыманне камерцыйных навучальных устаноў паступіла за 1912 г. 13 млн 568 тыс. р. З іх: 8 млн 161 тыс. р. — плата за навучанне (60,2 %); 180 тыс. р. — за пансіён (1,3 %); 243 тыс. р. — працэнты з капіталаў школ (1,8 %); 222 тыс. р. — дапамога з казны (1,6 %); 362 тыс. р. — дапамога ад гарадскіх дум і земстваў (2,7 %); 1 млн 60 тыс. р. — дапамога ад розных грамадскіх таварыстваў і прыватных асоб (7,8 %). Пры гэтым расходавана з іх было толькі 12 млн 830 тыс. р. Прыбытак школ за год склаў 738 тыс. р. (5,4 % ад усёй сумы). Такім чынам, штогод кожная з камерцыйных навучальных устаноў у сярэднім атрымлівала звыш неабходнага для сваёй дзейнасці па 1,5 тыс. р. (камерцыйныя вучылішчы былі, зразмела, больш прыбытковымі за астатнія тыпы школ), а гэта дазваляла ім мець лепшую за агульнаадукацыйныя школы матэрыяльна-выхаваўчую базу [5]. Калі ж увогуле аналізаваць прыведзеныя лічбы, то неабходна адзначыць поўную незалежнасць школ ад казны і, наадварот, поўную залежнасць ад платы за навучанне, якая была асноўнай крыніцай паступлення сродкаў. Такая залежнасць, дарэчы, вельмі негатыўна паўплывала на дзейнасць большасці школ у перыяд першай сусветнай вайны. Менавіта гэтым, у першую чаргу, тлумачыцца той факт, што да 1917 г. на вольнай ад нямецкай акупацыі Беларусі захаваліся толькі Мінскае, Віцебскае і Слуцкае камерцыйныя вучылішчы.

Такім чынам, прыведзеныя факты сведчаць аб важным месцы камерцыйнай асветы у дарэвалюцыйнай адукацыйнай справе. Разам з рэальнымі, камерцыйныя вучылішчы істотна дапаўнялі сярэднюю (гімназічную) ступень адукацыйнага працэсу, але мелі пры гэтым прафесійную арыентацыю, што было выклікана патрэбамі фарміравання капіталістычных адносін. Камерцыйная школа дазваляла значна палепшыць агульны ўзровень асветы насельніцтва і падрыхтаваць яго да істотных змен у грамадскім жыцці. Увогуле, дзейнасць на Беларусі камерцыйных

вучылішчаў заклала асновы айчыннай эканамічнай адукацыі, якая існуе і сёння ў выглядзе сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў у розных гарадах краіны на чале з Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам.

**Літаратура**

1. *Белецкий А.В.* Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования. 1803—1832. Отд. 3. Вильна, 1906.
2. *Новік Н.Я.* Прафесійная адукацыя на Беларусі: гісторыя і сучаснасць // Чалавек. Грамадства. Свет. 1997. Вып. 9.
3. *Пастухова З.А.* Среднее образование в дореволюционной Белоруссии. Мн., 1963.
4. Народное образование и педагогическая мысль России кануна и начала империализма. М., 1980.
5. *Иванов Н.* Коммерческое образование // Новый энциклопедический словарь. Петроград. 1915. Т. 22. Ст. 368—371.
6. Устав Минского семиклассного коммерческого училища. Мн., 1901.
7. *Шибеко З.В., Шибеко С.Ф.* Минск. Страницы дореволюционного города. Мн., 1990.
8. Памятная книжка Витебской губернии на 1912 год. Витебск, 1912.
9. Памятная книжка Минской губернии на 1910 год. Мн., 1910.
10. Памятная книжка Могилевской губернии на 1909 год. Могилев, 1909.
11. Могилев. Энциклопедический справочник. Мн,. 1990.
12. Памятная книжка Минской губернии на 1917 год. Мн., 1917.
13. *Новик Н.Е.* Профессиональное образование в Беларуси во второй половине XIX — начале XX вв: Автореф. дис. ... канд. истор. наук. Мн., 1999.

**І.І. НАВАСЕЛЬЦАВА**

# *АСНОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЛЕКСІКІ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ НІЛА ГІЛЕВІЧА*

Галоўнай задачай беларускай лексікалогіі па-ранейшаму застаецца максімальна поўны збор, сістэматызацыя і апісанне слоўнікавага складу творчасці выдатных прадстаўнікоў нацыянальнай літаратуры, без чаго немагчыма ніякае даследаванне іх мовы.

"Як ні пра каго іншага з беларускіх паэтаў пра Ніла Гілевіча можна сказаць, што яго паэзія — паэзія на кожны дзень, у якой філасофія так блізка змыкаецца з мараллю, урэшце, з парадай, а таму становіцца нейкай дамашняй, па-асабліваму цёплай і чалавечнай" [1, *179*]. Адметнасць мовы паэтычных твораў Ніла Гілевіча праяўляецца ва ўсім — у дакладным, добра ўзважаным словаўжыванні, у глыбокім разуменні і адчуванні сэнсавай нагрузкі моўных адзінак, ва ўменні звычайнымі сродкамі стварыць арыгінальны мастацкі вобраз. Вывучаючы жывую народную мову, засвойваючы яе незлічоныя скарбы, паэт свядома выяўляе ўсё самабытнае, свежае і ўводзіць у літаратурны ўжытак. Любы яго твор, паводле трапнага азначэння А. Зарыцкага, "...вылучаецца арыгінальнасцю і свежасцю мовы. Невычэрпныя фальклорныя багацці нашага народа тояць у сабе мноства самых нечаканых і разнастайных магчымасцей для выкарыстання іх у літаратуры. Ніл Гілевіч па-майстэрску ўмее падабраць ключы да гэтых скарбаў" [2].

Выключная ўвага да слоўнікавага складу творчасці паэта тлумачыцца тым, што літаратурная мова "вызначаецца не фанетыка-марфалагічнай базай, а асаблівасцямі семантычнай сістэмы лексіка-семантычных адносін" [3, *57*]. Вывучэнне іх у першую чаргу патрабуе аналізу лексічных значэнняў слоў.

Слоўнік паэтычных твораў Ніла Гілевіча складаецца з больш як 5400 паўназначных слоў і 4800 словаўжыванняў. З іх на галоўныя часціны мовы прыпадае больш за 4500 слоў і каля паловы ўсіх словаўжыванняў. Астатнія словы — гэта прыслоўі, займеннікі, лічэбнікі і г.д. (Лексіка паэтычных твораў Ніла Гілевіча распісана па выданнях: *Гілевіч Н.* Выбраныя творы. У 2 т. Мн., 1981, 1991).

*Інеса Іванаўна НАВАСЕЛЬЦАВА, ст. выкладчык кафедры беларускай і рускай моў БДЭУ.*